# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА
# ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

## 10 клас
## Варыянт 2

**Заданне 1.** Супрацоўнікі музеяў займаюцца надзвычай складанай, але вельмі карыснай і цікавай справай і ўжываюць пры гэтым адпаведныя спецыяльныя словы.

Запішыце лексіку музейнай справы згодна з нормамі беларускага правапісу.

*Максімальная колькасць балаў* – ***6.***

| Словa | Правільны варыянт напісання |
|---|---|
| гістарычныя дасле(д,да)ванні | |
| пр(ы,э)зентацыя экспазіцыі | |
| унікальны экз(е,э)мпляр | |
| музейная перы(ё,о)дыка | |
| гісторыка-культурны ла(н,нд)шафт | |
| рэкр(ыя,эа)цыйная функцыя музея | |

**Заданне 2.** У музейнай справе важна правільна выбраць экспанаты для калекцыі і размясціць іх у такім парадку, каб яны дакладна адпавядалі тэме экспазіцыі.

Лексічныя значэнні таксама павінны дакладна адпавядаць “свайму” слову. Выберыце для слоў з левага слупка адпаведныя ім значэнні з правага слупка. Вынік запішыце ў наступным выглядзе: А1Б2В3.

*Максімальная колькасць балаў* – ***6.***

| | |
|---|---|
| **А – бяспечны** | 1 – гульня, пацеха |
| | 2 – агародная расліна сямейства гарбузовых з паўзучым сцяблом, буйны круглы або авальны плод гэтай расліны; страва з гэтага плода |
| **Б – гарбуз** | 3 – злучэнне металічных частак шляхам сплаўлівання |
| | 4 – якому не пагражае небяспека, надзейна ахаваны |
| **В – вяселле** | 5 – інфармацыйны, камп’ютарны |
| | 6 – спрэчка, якая суправаджаецца крыкам; лаянка |
| **Г – сварка** | 7 – які з лёгкасцю адносіцца да жыццёвых спраў і турбот; бесклапотны |
| | 8 – называць грубымі, зневажальнымі, абразлівымі словамі |
| **Д – штучны** | 9 – расліна з ляжачымі сцёбламі і вялікімі пладамі з салодкай мякаццю чырвонага колеру |
| | 10 – падаваць адрывістыя гукі (пра сабаку) |
| **Е – лаяць** | 11 – абрад шлюбу і ўрачыстасць, святкаванне, звязанае з гэтым |
| | 12 – ненатуральны, зроблены накшталт сапраўднага, прыроднага; прытворны, няшчыры |

| А | | Б | | В | | Г | | Д | | Е | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|

**Заданне 3.** Музеі захоўваюць матэрыяльную спадчыну беларусаў, пераносячы нас у свет дзівосных рэчаў, на якіх калісьці трымалася жыццё нашага народа. Фразеалогія ж прыадчыняе перад намі дзверы ў духоўнае мінулае нашых продкаў, паказваючы, як яны ўспрымалі свет, якімі каштоўнасцямі жылі. Таму веданне фразеалагізмаў – яскравае сведчанне прылучанасці чалавека да сваёй культуры.

Прадэманструйце, як вы валодаеце беларускай фразеалогіяй: у пададзеных фразеалагізмах вызначце прапушчаны кампанент, выбраўшы яго з прапанаваных у трэцім слупку. Насупраць абранага кампанента пастаўце ў апошнім слупку знак “+”.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| Фразеалагізм | Значэнне | Кампанент | + |
|---|---|---|---|
| *... можна есці* | ‘не дрэнны і не добры, пасрэдны’ | *папярчыўшы* | |
| | | *пасаліўшы* | |
| | | *пасаладзіўшы* | |
| | | *пасмактаўшы* | |
| | | *з галадухі* | |
| *зандзіраваць ...* | ‘разведваць што-н., каб вызначыць шанцы на поспех’ | *чуткі* | |
| | | *думкі* | |
| | | *настроі* | |
| | | *паветра* | |
| | | *глебу* | |
| *калос на ... нагах* | ‘што-н. велічнае знешне, але слабае, гатовае распасціся’ | *саламяных* | |
| | | *драўляных* | |
| | | *гліняных* | |
| | | *шкляных* | |
| | | *дрыготкіх* | |
| *камандаваць ...* | ‘распараджацца, быць завадатарам, верхаводзіць, аказваць уплыў на ход чаго-н.’ | *парадам* | |
| | | *аркестрам* | |
| | | *сімфоніяй* | |
| | | *банкетам* | |
| | | *фуршэтам* | |
| *... за пазухай* | ‘скрытая, затоеная злосць, нядобры намер’ | *ножык* | |
| | | *сцізорык* | |
| | | *камень* | |
| | | *пуга* | |
| | | *змяя* | |
| *як ... з канапель* | ‘зусім нечакана, знянацку (выскачыць, з’явіцца)’ | *Хадос* | |
| | | *Тарас* | |
| | | *Панас* | |
| | | *Піліп* | |
| | | *Архіп* | |

**Заданне 4.** Экспанаты ў музейных залах і на паліцах заўсёды размяшчаюцца на падставе дэталёвага ўліку суадносін паміж імі. Гэтаксама скрупулёзна моваразнаўцы вызначаюць адносіны вытворнасці паміж словамі.

Вам прапанаваны шэсць дзеясловаў. Адзін з іх мае два вытворныя простыя прыметнікі, чатыры – па адным, а яшчэ адзін вытворных прыметнікаў не мае. З улікам пададзенай інфармацыі паспрабуйце і вы да прапанаваных дзеясловаў дакладна падабраць усе магчымыя вытворныя ад іх простыя прыметнікі. Запішыце іх у адпаведных радках табліцы (у адным з радкоў пастаўце прочырк).

***Заўвага***. Прыметнік можна падбіраць зыходзячы з любога значэння дзеяслова.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | |
|---|---|
| *ліпнуць* | |
| *расплывацца* | |
| *адразаць* | |
| *выкрываць* | |
| *урадзіць* | |
| *грэбці* | |

**Заданне 5.** Давайце пазнаёмімся з адным з найбольш цікавых беларускіх музеяў. Прачытайце тэкст пра найстарэйшую музейную ўстанову Рэспублікі Беларусь – Гомельскі палацава-паркавым ансамбль – і запоўніце ячэйкі табліцы зыходзячы з пастаўленай у кожнай ячэйцы задачы.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

Гомельскі палацава-паркавы ансамбль – адна з найстарэйшых музейных устаноў Рэспублікі Беларусь. У яго склад уваходзяць ***шэсць аб’ектаў***[1]: ***палац Румянцавых і Паскевічаў***[2], капліца-пахавальня князёў Паскевічаў, адміністрацыйны будынак, «Зімовы сад», назіральная вежа, парк. Будынкі ўстановы з’яўляюцца помнікамі архітэктуры XVIII–XIX стст. і ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей, якія ахоўваюцца дзяржавай.

Калекцыя музея Гомельскага палацава-паркавага ансамбля самая багатая ў Рэспубліцы Беларусь і дае ўяўленне аб убранні багатых дваранскіх сядзіб канца XIX ст. Дастойнае месца ў экспазіцыях і зборах музея займаюць матэрыялы ***аб выдатных дзяржаўных дзеячах***[3], военачальніках, прадстаўніках навукі, культуры, адукацыі, жыццё і дзейнасць якіх былі звязаны з гісторыяй краю, а таксама калекцыя жывапісу гомельскіх мастакоў.

Музей пастаянна папаўняецца новымі экспанатамі. ***На працягу года***[4] яго наведваюць ***звыш 300 000 чалавек***[5], ***штогод арганізуецца***[6] каля 100 новых выстаў, праводзяцца розныя мерапрыемствы і канцэрты. *(Паводле інтэрнэт-рэсурсаў.)*

| | | |
|---|---|---|
| I. У падкрэсленым дзеяслове адзначце корань, запішыце колькасць гукаў у корані<br><br>________________<br>________________ | II. Састаўны лічэбнік запішыце словамі ў творным склоне<br><br>________________<br>________________ | III. Выпішыце кароткі дзееprыметнік з суфіксам -*н-*<br><br>________________<br>________________ |
| VI. Выпішыце ў адпаведнай кантэксту форме лічэбнік, які ўжываецца ў значэнні займенніка<br><br>________________<br>________________ | V. Выпішыце ў адпаведнай кантэксту форме адносны займеннік, які выконвае функцыю азначэння<br><br>________________<br>________________ | VI. Выпішыце назоўнік, род якога (пры амаль аднолькавым напісанні) не супадае ў беларускай і рускай мовах<br><br>________________<br>________________ |

(Падкрэслена ў тэксце: з’яўляюцца.)

**Заданне 6.** Устанавіце адпаведнасць паміж выдзеленымі ў тэксце папярэдняга задання словазлучэннямі (спалучэннямі слоў) і іх характарыстыкамі. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэнняў літар і лічбаў (напрыклад: А1Б2В3). Улічыце, што не ўсе словазлучэнні (спалучэнні слоў) могуць адпавядаць акрэсленым патрабаванням, а таму могуць быць пазіцыі без правільнага адказу.

***Характарыстыкі:***

А – Дапасаванне, сінтаксічна несвабоднае.
Б – Складанае словазлучэнне.
В – Кіраванне з галоўным словам – лічэбнікам.
Г – Кіраванне з галоўным словам – прыслоўем.
Д – Прымыканне.
Е – Не словазлучэнне.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **А** | | **Б** | | **В** | | **Г** | | **Д** | | **Е** | |

**Заданне 7.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

В залах музея «Лошицкая усадьба» воссоздана атмосфера светского быта конца XIX – начала XX столетия. Здесь можно увидеть восстановленные интерьеры XIX в., изразцовые печи и лепной декор, антикварную мебель и предметы искусства соответствующей эпохи из частных коллекций и собрания Музея истории города Минска. Исторический раздел экспозиции знакомит любителей старины с этапами становления и развития Лошицы с X века по советское время. *(По материалам сайта www.loshytsa.museum.by.)*

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

**Заданне 8.** Нарэшце мы паспрабуем зрабіць уласны віртуальны музей беларускай літаратуры і мастацтва.

Першая Ваша задача – стварыць меню сайта нашага музея (пабудаваць іерархію літаратуразнаўчых тэрмінаў і паняццяў). Для гэтага трэба з прапанаваных у даведцы паняццяў выбраць тры, якія з’яўляюцца агульнымі для шэрагу іншых. Насупраць кожнага агульнага паняцця запішыце тыя, якія ў яго ўваходзяць. Тыя тэрміны і паняцці, якія не ўвайшлі ні ў адну з трох груп, напішыце насупраць “Іншае”.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

*Узор:*




*Даведка*: анафара, байка, верлібр, жанр, навела, параўнанне, плынь, рыфмоўка, сімвалізм, троп, футурызм, эпітэт.




**Заданне 9.** Другая задача – стварыць вітрыну ў зале, прысвечанай творчасці Якуба Коласа. Для гэтага з прапанаваных “экспанатаў” трэба адабраць чатыры, якія найбольш падыходзяць і напрамую звязаны з жыццём і творчасцю песняра. Патлумачце свой выбар. Каб выканаць заданне, устаўце нумар “экспаната” і напішыце тлумачэнне свайго выбару.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

*Экспанаты для выбару*

| Нумар | Экспанаты |
|---|---|
| 1 |  |
| 2 |  |
| 3 |  *Настаўніцкі інстытут у Магілёве* |
| 4 |  |
| 5 |  *Настаўніцкая семінарыя ў Нясвіжы* |
| 6 |  |
| 7 |  |
| 8 |  |

| Нумар экспаната | Тлумачэнне |
|---|---|
| | |
| | |
| | |
| | |

**Заданне 10.** Прыйшоў час прыцягнуць увагу да нашага віртуальнага музея беларускай літаратуры і мастацтва. Распрацуйце для яго рэкламны пост, які прыцягне ўвагу настаўнікаў. Ваша задача – цікава і арыгінальна расказаць пра перавагі віртуальнага музея і/або яго ўнікальныя магчымасці, згадаць хаця б двух беларускіх пісьменнікаў XIX стагоддзя і хаця б па адным іх творы, натхніць наведаць віртуальны музей менавіта настаўнікаў (!). Выкарыстанне нестандартных ідэй, яркіх вобразаў, гумару вітаецца. Пост не павінен быць большым за 100 слоў. Поспехаў!

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

____________________________________________________________________________